**Суддзя Э.С.,** *дацэнт*

# БІБЛІЯТЭЧНА-БІБЛІЯГРАФІЧНАЕ АБСЛУГОЎВАННЕ ПА МАСТАЦТВУ Ў НАЦЫЯНАЛЬНАЙ БІБЛІЯТЭЦЫ БЕЛАРУСІ

Бібліятэчна-бібліяграфічным абслугоўваннем па мастацтву ў Нацыянальнай бібліятэцы займаюцца два спецыялізаваныя аддзелы: аддзел мастацтва і аддзел навуковай інфармацыі па культуры і мастацтву. Яны абслугоўваюць спажыўцоў (чытачоў, карыстальнікаў) усіх катэгорый. Колькасць наведванняў у 1994 г. склала больш за 30 тысяч, сярэднядзённая наведвальнасць аддзела мастацтва - 97 чалавек. Назіраецца тэндэнцыя да павелічэння колькасці аматараў мастацтва; на жаль, колькасць спецыялістаў памяншаецца.

Фонд аддзела мастацтва складаюць кнігі, перыядычныя выданні, нотныя выданні і гуказапісы, дыяпазітывы і дыяфільмы, выяўленчыя выданні. На працягу апошніх двух гадоў ён актыўна папаўняецца замежнымі перыядычнымі выданнямі.

Дынаміка выдачы дакументаў наступная: 1992 г. - 226232, 1993 г. - 221004, 1994 г. - 266063. Найбольш высокі працэнт прыходзіцца на выдачу перыядычных выданняў па мастацтву.

Абслугоўванне АВД здзяйсняецца ў фанатэцы - падраздзяленні аддзела мастацтва. Яе асноўныя карыстальнікі - студэнты, якія складаюць 68,7%, спецыялісты па музычнай



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

культуры (17,3%), аматары музыкі (14 %). Выдача фонадакументаў складае 88 % ад агульнай выдачы. Тут назіраецца рэзкае павелічэнне ў параўнанні з 1992 г., калі выдача фонадакументаў складала ўсяго 9%. Найбольшым попытам карыстаецца класічная музыка.

Значна павялічылася выдача нотных выданняў. Калі ў 1992 г. яна складала 5 %, то ў 1994 г. - 16,8%. Такой дынаміцы ў значнай ступені спрыяла ўвядзенне платнай паслугі па ксеракапіраванні нотных тэкстаў.

ДБА па мастацтву здзяйсняецца аддзелам мастацтва ў каардынацыі з даведачна-бібліяграфічным аддзелам, чытальнымі заламі, аддзеламі замежнай літаратуры, старадрукаваных дакументаў, беларускай літаратуры, інфармацыі па культуры і мастацтву. Усе складаныя даведкі выконваюцца ў аддзеле мастацтва. Каэфіцыент ДБА дастаткова высокі - 0,9. Відавочна прасочваецца дынаміка ўзрастання колькасці выкананых даведак, сярод якіх пераважаюць тэматычныя (да 80 %). Даведкі выконваліся як для калектыўных карыстальнікаў («Беларусьфільм», Беларускае тэлебачанне, відэацэнтры, музычны ліцэй і інш.), так і па індывідуальных запытах.

Традыцыйнай формай абслугоўвання з'яўляецца абслугоўванне ў рэжыме «запыт—адказ». Форма падачы інфармацыі ў гэтым рэжыме дыктуецца заказчыкам і ўключае аналітычныя агляды, бібліяграфічныя спісы, тэматычныя даведкі, копіі дакументаў і г.д. Пераважаюць фактаграфічныя даведкі, у 1994 г. іх было выканана 247. У АНІКМ у рэжыме «запыт—адказ» выконваліся аналітычныя даведкі.

Па дагаворнаму абслугоўванню складаюцца бібліяграфічныя спісы, тэматычныя і фактаграфічныя даведкі, праводзяцца кніжныя выставы, дні спецыялістаў і інш.

Недыферэнцыраванае абслугоўванне здзяйсняецца праз платныя падпісныя інфармацыйныя выданні: «Культурнае жыццё Беларусі», «Штотыднёвы агляд літаратуры па культуры і мастацтву» і інш.

Для Міністэрства культуры аддзел рэгулярна рыхтуе «Негативные материалы областной и районной прессы в адрес

организаций культуры и искусства республики». Інфармацыя ў рэжыме ДАКР даецца ў аўтаматызаваным варыянце.

Аддзел мастацтва актыўна здзяйсняе масавае бібліяграфічнае абслугоўванне: кніжныя выставы і выставы другіх дакументаў, прэзентацыі кніг, бібліяграфічныя агляды па розных відах мастацтва, выступленні па радыё і тэлебачанні, гутаркі-знаёмствы, прагляды літаратуры і г.д.

Аддзел шмат увагі надае распрацоўцы аўтаматызаваных баз даных. Ужо створана база «Ноты», уводзіцца інфармацыя аб кнігах у электронны каталог.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ